# Вачыма партнёра і сябра

## Беларусь – Японія: новыя магчымасці ў новых рэгіянальных умовах



Руслан ЕСІН, доктар палітычных навук, дацэнт

**2016 год стаў для шматвектарнай знешняй палітыкі Беларусі ў многім вызначальным. Перш за ўсё таму, што ўдалося пераканаць нашых замежных партнёраў адысці ад звыклых стэрэатыпаў і паглядзець на нашу краіну без прадузятасці. Беларусь паказала ўсяму свету: суверэнная, незалежная краіна, якая, няхай і не валодае эканамічным і ваенным патэнцыялам звышдзяржаў, можа многае зрабіць для падтрымання стабільнасці і бяспекі ў сваім рэгіёне ва ўмовах супярэчнасцей глабальнага характару.**

Па-першае, з трыбуны Генеральнай Асамблеі ААН было заяўлена аб неабходнасці пашырэння гарызонтаў рэгіянальнай інтэграцыі. Коратка: дадзены падыход, якога прытрымліваюцца многія дзяржавы, можна ахарактарызаваць як «інтэграцыя інтэграцый» *[1]*.

Па-другое, Мінск як сталіца дзяржавы, якая лічыцца «полюсам стабільнасці» ў Еўропе, лагічна стаў месцам для абмеркавання самых вострых пытанняў адносін Усходу і Захаду *[2]*. Рэзультатыўнасць перагавораў «нармандскай чацвёркі» пацвердзіла правільнасць такога выбару.

Па-трэцяе, заклік Беларусі да мабілізацыі намаганняў сусветнай супольнасці супраць пагрозы тэрарызму, нелегальнай міграцыі, пагаршэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі знайшоў самы актыўны водгук і падтрымку на ўсіх кантынентах.

Таму цалкам заканамерным з'яўляецца ўмацаванне ўзаемаадносін Беларусі з краінамі – членамі БРІКС, ШАС, Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі, МЕРКОСУР. Важна адзначыць атрыманне нашай краінай у 2016 годзе статусу наглядальніка ў Асацыяцыі карыбскіх дзяржаў і ШАС. За гэтым стаіць прагматычны інтарэс – садзейнічанне вырашэнню задачы пашырэння прысутнасці на рынках краін «далёкай дугі».

Так, ужо наладжана ўзаемадзеянне з нядаўна адкрытым Банкам развіцця БРІКС у мэтах прыцягнення фінансавання праектаў у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку.

У мінулым годзе Беларусь упершыню прыняла ўдзел у саміце «16+1» (краіны Цэнтральнай, Усходняй Еўропы і Кітая), які адбыўся ў Рызе. Нягледзячы на рознагалоссі з ЕС па асобных тэмах, у цэлым дыялог прыняў канструктыўны напрамак. Важным практычным дасягненнем стала адмена Еўрапейскім саюзам у 2016 годзе колькасных абмежаванняў на імпарт беларускіх тэкстыльных вырабаў і адзення, якія існавалі з 1993 года.

Удзел Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе акрамя ўмацавання гандлёва-эканамічных сувязей у рамках Саю-

### ПРА АЎТАРА

ЕСІН Руслан Алегавіч.
Нарадзіўся ў 1969 годзе. Скончыў Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча (1990), Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (1993), Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (1993), Дыпламатычную акадэмію Міністэрства замежных спраў Расіі (1996).
З 1991 года – на дзяржаўнай службе ў Міністэрстве культуры і друку, Міністэрстве замежных спраў Беларусі. У 2000–2003 гадах – саветнік па гандлёва-эканамічных пытаннях Пасольства Беларусі ў Венгрыі, з 2006 года – генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску (Польшча), з 2011 года – намеснік начальніка ўпраўлення СНД і ЕўрАзЭС Міністэрства замежных спраў Беларусі. З сакавіка 2014 года – намеснік дырэктара Дэпартамента – начальнік упраўлення забеспячэння знешнеэканамічнай дзейнасці, з чэрвеня 2016-га – намеснік дырэктара Дэпартамента – начальнік упраўлення каардынацыі знешнеэканамічнай дзейнасці Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.
З красавіка 2017 года – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Японіі.
Доктар палітычных навук (2012).
Аўтар трох манаграфій і больш як 40 публікацый.
Сфера навуковых інтарэсаў: пытанні палітычнага рэгіяналізму.

за дазваляе паспяхова вырашаць задачу па адкрыцці рынкаў трэціх краін для нарошчвання беларускага экспарту.

Дзякуючы сумесным намаганням саюзнай «пяцёркі» ўжо сёння ёсць магчымасць бяспошліннага ўвозу на рынак В'етнама шырокага спектра прадукцыі беларускіх экспарцёраў у рамках пагаднення аб свабодным гандлі, якое было заключана паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і В'етнамам. Важны аспект – прадукцыя, якая выраблена на сумесных прадпрыемствах у В'етнаме, мае свабодны доступ на рынкі іншых дзяржаў. Такім чынам вырашаецца стратэгічная задача значнага ўмацавання нашых пазіцый у Паўднёва-Усходняй Азіі, у тым ліку з падключэннем восі «Асацыяцыя краін Паўднёва-Усходняй Азіі – Японія». У сучасных умовах няпэўнасці эканамічнай сітуацыі ў Кітаі, абвастрэння тэрытарыяльных спрэчак у рэгіене Паўднева-Кітайскага мора гэты напрамак адносіцца да ліку ключавых на сусветнай палітычнай арэне.

Згаданыя абставіны прадвызначаюць і беларускі інтарэс да пераходу на якасна новы ўзровень супрацоўніцтва з Японіяй – Краінай узыходзячага сонца, як яе назваў больш за 1400 гадоў таму японскі прынц-рэгент Шатоку *[3]*.

Можа здацца дзіўным, але беларуска-японскія сувязі маюць даўнюю гісторыю. У іх станаўленні вялікую ролю адыграла дзейнасць на пасадзе першага расійскага консула ў Японіі (1858–1865) нашага суайчынніка, ураджэнца вёскі Гошкі Рэчыцкага павета І.А. Гашкевіча. Іосіф Антонавіч, маючы багаслоўскую адукацыю, падчас 10-гадовай духоўнай місіі ў Кітаі вывучаў кітайскую і японскую мовы, усходнюю філасофію, прыродазнаўчыя навукі, быў выдатным усходазнаўцам. Значным укладам І.А. Гашкевіча ў навуку з'яўляюцца першы японска-рускі слоўнік і трактат «Аб вытоках японскай мовы».

Па ініцыятыве консула ў г. Хакадатэ на востраве Хакайда былі адкрыты школы рускай мовы, фатаграфіі, выдадзена руская азбука для японцаў. У пабудаванай пры консульстве бальніцы маламаёмныя японцы маглі бясплатна атрымліваць



▲ **Парламенцкая дэлегацыя Японіі на чале з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, кіраўніком групы дружбы «Японія – Беларусь» Гэніціра Сата ў Парку высокіх тэхналогій. Мінск, 2016 год**

медыцынскую дапамогу. Апошнія гады жыцця выдатны сын беларускага народа правёў на роднай зямлі, у маёнтку Малі, што непадалёку ад Астраўца Гродзенскай вобласці. У гэтым беларускім гарадку і ў японскім Хакадатэ І.А. Гашкевічу ўстаноўлены помнікі, яго імем названа вуліца ў Мінску, заліў у Японскім моры *[4]*.

У XX стагоддзі значны ўклад у развіццё беларуска-японскіх грамадска-палітычных сувязей унеслі прафесіянальныя саюзы. За шэсць гадоў, з 1965 па 1970, беларускія прафсаюзныя арганізацыі прынялі каля 20 японскіх дэлегацый. Кіраўнік адной з іх Х. Суэтансі так ацаніў гасціннасць беларускага народа: «Ад японскіх прафактывістаў, якія раней пабывалі ў Мінску, мы чулі, што тут сустракаюць вельмі цёпла. І гэта поўнасцю пацвердзілася. Нас сустракалі па-брацку. Мы адчуваем сябе ў вашым горадзе як дома» *[5]*.

Беларуска-японскія сувязі пачалі складвацца яшчэ ў савецкія часы. У 1980 годзе нашай рэспубліцы было даверана сфарміраваць праграму Дзён савецкай культуры ў Японіі. Тады ў склад дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, фальклорнага ансамбля з Гродна. А ўжо ў 1982 годзе ў Японіі прайшлі Дні беларускай культуры, асновай якіх сталі выступленні танцавальнага ансамбля «Харошкі».

Дакладнае выкананне Беларуссю Статута ААН, прынцыпу непарушнасці граніц і іншых агульнапрынятых палажэнняў дало магчымасць нашай маладой незалежнай дзяржаве заваяваць высокі аўтарытэт на міжнароднай арэне і ўсталяваць дружалюбныя адносіны са многімі краінамі.

Японія адной з першых прызнала Рэспубліку Беларусь. Гэта адбылося 28 снежня 1991 года, а ўжо 26 студзеня 1992-га паміж дзяржавамі былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны. У студзені 1993 года ў Мінску пачало работу японскае пасольства, а ў чэрвені 1995 года ў сталіцы Японіі – беларускае.

Важнай падзеяй, якая надала значны імпульс развіццю беларуска-японскага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, стаў візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі А. Лукашэнкі ў Японію ў лютым 1998 года ў час зімовых Алімпійскіх гульняў у Нагана.

Узровень гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі выдатна характарызуюць статыстычныя даныя аб тавараабароце. Калі ў 1995 годзе ён складаў 21,7 млн долараў, то ў 2007 годзе дасягнуў максімальнага значэння – 322,3 млн долараў. Аб'ём беларускага экспарту ў Японію дасягнуў у 2011 годзе ўзроўню 10 млн долараў. У апошнія пяць гадоў ён захоўваецца прыкладна на адным узроўні (у 2016 годзе – 11,9 млн долараў). Акрамя калійных угнаенняў, якія займаюць ільвіную долю ў нашым экспарце ў Японію, у японскіх спажыўцоў карыстаюцца попытам беларускія лазерныя і аптычныя вымяральныя прыборы, шкловалакно, малочная прадукцыя.

▼ Канцэрт у гонар японскіх школьнікаў, якія адпачываюць у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня»



Відавочна, што свой экспартны патэнцыял эканоміка Беларусі выкарыстоўвае не поўнасцю. Прывяду такія лічбы: у 2016 годзе экспарт Літвы ў Японію склаў 130 млн еўра, Чэхіі – 840 млн еўра *[6]*. Ёсць над чым задумацца. Нам яўна не хапае высокатэхналагічных тавараў з высокай дабаўленай вартасцю, якія былі б запатрабаваны не толькі на традыцыйных рынках СНД, але і ў краінах, якія адносяцца да вядучых сусветных вытворцаў такіх тавараў, у тым ліку Японіі.

Таму першачарговае пытанне парадку дня – стварэнне ў Беларусі новых экспартаарыентаваных прадпрыемстваў за кошт уласных рэсурсаў або замежных інвестыцый. Маецца вопыт узаемадзеяння ў гэтым напрамку: пік дзелавой актыўнасці японскіх кампаній у нашай краіне прыпаў на 2010–2011 гады, калі ў беларускую эканоміку з Японіі паступіла звыш 37 млн долараў інвестыцый.

З удзелам японскага капіталу на ААТ «БМЗ» плануецца наладзіць вытворчасць труб нафтавага асартыменту, на ААТ «Гродна Азот» – аміяку і карбаміду. Разглядаецца пытанне аб стварэнні прадпрыемства па выпуску відэачыпаў у беларуска-японскай прамысловай зоне ў Магілёўскай вобласці.

У сучасных умовах нельга вымяраць эфектыўнасць міжнароднага супрацоўніцтва, тым больш з такой краінай, як Японія, адным толькі тавараабаротам. Прыярытэтным напрамкам работы павінен стаць пошук і выкарыстанне ўзаемнага інтарэсу ў сферы навукі і тэхналогій. У нас ёсць распрацоўкі сусветнага ўзроўню, напрыклад, у галіне аховы здароўя, якія беларускія і японскія вучоныя маглі б сумесна развіваць і прасоўваць на рынак у якасці камерцыйных прадуктаў. Сумеснымі намаганнямі можна рэалізоўваць праекты, якія сёння здаюцца фантастычнымі.

Адзначым, што адна з найбольш значных за апошні час здзелак коштам 900 млн долараў была заключана ў 2014 годзе паміж японскай кампаніяй электроннага гандлю Rakuten і рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій мабільным сэрвісам Viber, распрацаваным у Беларусі.

Як вядома, беларускі і японскі народы перанеслі цяжкія наступствы маштабнага атамнага ўздзеяння. У свой час японскі вопыт аказання медыцынскай дапамогі пацярпелым ад смяротнага выпрамянення, барацьбы з радыеактыўным заражэннем быў паспяхова выкарыстаны ў Беларусі. У рамках праграмы «Карані травы» ўрад Японіі фінансуе пастаўку абсталявання ў беларускія медыцынскія ўстановы: рэалізавана 37 праектаў на суму каля 3 млн долараў *[7]*. Акрамя ўрадавай дапамогі, на працягу больш за 20 гадоў падтрымку Беларусі аказваюць грамадскія аб'яднанні розных гарадоў Краіны ўзыходзячага сонца.

У сваю чаргу, Беларусь не засталася ўбаку ад чужой бяды пасля аварыі на АЭС «Фукусіма-1». Дапамога ў пераадольванні наступстваў аварыі аказвалася як на дзяржаўным узроўні, так і па лініі «народнай дыпламатыі».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прыняў рашэнне аб выдзяленні сродкаў для адпачынку ў нашай краіне падлеткаў з пацярпелых ад стыхійных бедстваў тэрыторый Японіі і, пачынаючы з 2012 года, японскія школьнікі прыязджаюць у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» *[8]*.

«Такая дружалюбная падтрымка Беларусі, як матэрыяльная, так і маральная, адыграла важную ролю ў працэсе аднаўлення Японіі і адраджэння духу японскага народа. Карыстаючыся нагодай, Японія выказвае вялікую падзяку Беларусі за аказаную дапамогу і ўвагу», – гэты запіс можна ўбачыць на сайце Пасольства Японіі ў Беларусі *[9]*.

У снежні 2012 года Беларусь і Японія заключылі міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне пераадольвання наступстваў аварыі на атамных электрастанцыях. Дэлегацыі з Фукусімы неаднаразова наведвалі Гомель, Мінск і іншыя беларускія гарады для вывучэння вопыту Беларусі ў пытаннях радыяцыйнай бяспекі.



▲ Медыцынскае абсталяванне, закупленае па праграме «Карані травы», перададзена Брэсцкай абласной бальніцы. Пра гэта сведчыць сімвалічная шыльда на сцяне, якую замацоўваюць часовы павераны ў справах Японіі ў Беларусі Хірокі Такунага і галоўны ўрач медустановы Аляксандр Карпіцкі. 2017 год

У маі 2016 года да 30-й гадавіны чарнобыльскай катастрофы і 5-годдзя аварыі на АЭС «Фукусіма-1» у Мінску ў парку Дружбы народаў прадстаўнікамі дзвюх краін была сумесна закладзена Алея сакуры.

Культурныя традыцыі Беларусі і Японіі шматгранныя, самабытныя і ўнікальныя. У кожнай з краін рэгулярна праводзяцца мерапрыемствы, якія знаёмяць з культурнымі і гістарычнымі традыцыямі беларускага і японскага народаў. Значнымі падзеямі ў жыцці беларускай сталіцы сталі Тыдзень сучаснага японскага кіно, фестываль «Японская восень

▼ У час пасадкі Алеі сакуры ў парку Дружбы народаў. Мінск, 2016 год






▲ **Фільм «Малітва Ліры» японскага рэжысёра Хіраюкі Куракавы (на здымку – справа) узнагароджаны прызам Прэзідэнта Беларусі «За гуманізм і духоўнасць у кіно» на XXIII Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад». Мінск, 2016 год**

у Беларусі». 13 лістапада 2015 года на XXII Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад» дыпломам у намінацыі «За цуд веры ў кіно, за веру ў цуд жыцця» атрымаў фільм японскага рэжысёра Іціра Ямамата «Анахіта (выбраннік)».

Аматарам мастацтва добра вядома беларуская балетная школа, яркай прадстаўніцай якой з'яўляецца экс-салістка Нацыянальнага тэатра оперы і балета Беларусі Мікі Ватанабэ. У сакавіку 2013 года сумесна з Народным артыстам Беларусі Валянцінам Елізар'евым японская балерына прыняла ўдзел у пастаноўцы балета «Лебядзінае возера» ў галоўным тэатры Бунка Кайган у Токіа. У лістападзе мінулага года другая японская балерына – Мікі Сузукі – выканала партыю Адэты – Адыліі ў гэтым жа спектаклі, але ўжо ў Мінску, у Музычным тэатры.

Актыўна працуюць такія арганізацыі, як «Беларусь – Японія», японская «Асацыяцыя дружбы і парламенцкіх сувязей з Рэспублікай Беларусь». «Беларускае таварыства дружбы» займаецца падрыхтоўкай Дзён беларускай культуры, выставак, рэалізуе праграмы «Пародненыя гарады», «Адпачынак і аздараўленне дзяцей з чарнобыльскіх раёнаў». Пры садзейнічанні названых арганізацый у Гомелі ў кастрычніку 2011 года была прадстаўлена выстаўка японскай культуры, традыцый і быту «Планета Японія», а ў сакавіку 2015-га – выстаўка «Тайны і казкі Японіі» *[10]*.

За амаль паўвекавую гісторыю супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў Мінска і Сендая рэалізаваны шэраг сумесных праектаў, абменаў, культурных і гуманітарных акцый. Сярод іх – устаноўка «Гадзінніка дружбы» і пасадка саджанцаў сакуры ў Сендайскім скверы Мінска, правядзенне гарадскімі ўладамі Сендая дабрачынных акцый для пацярпелых ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, перадача японскімі партнёрамі сталічным урачам медыцынскага абсталявання, хірургічных інструментаў, арганізацыя для іх стажыровак у сендайскіх клініках.

Нягледзячы на геаграфічную аддаленнасць Беларусі і Японіі, патэнцыял супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі невычэрпны. У нас ёсць узаемнае імкненне да пашырэння эканамічных, навуковых, гуманітарных, культурных кантактаў. Можна з упэўненасцю сказаць, што дыялог Беларусі і Японіі – гэта дыялог сяброў і партнёраў, і ён будзе працягвацца.

## ЛІТАРАТУРА


1. Тезисы выступленния заместителя министра иностранных дел Республики Беларусь В.Б. Рыбакова на 71-й сессии Генеральной Ассамблеи. – Нью-Йорк, 2016.
2. Лукашэнка: Беларусь усё больш успрымаецца як полюс стабільнасці ў рэгіёне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.belarus.by/by/government/events/lukashenka-belarus-use-bolsh-usprymaetstsa-jak-poljus-stablnasts--regene_i_49084.html. – Дата доступу: 10.03.2017.
3. Почему Япония называется Страной восходящего солнца [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: https://www.factroom.ru/facts/48128. – Дата доступа: 24.02.2017.
4. Шадурский, В. Иосиф Гошкевич как символ белорусско-японского сотрудничества (к 200-летию со дня рождения известного дипломата и ученого-ориенталиста) / В. Шадурский // Журнал международного права и международных отношений. – 2014. – № 2. – С. 9–11.
5. Варабей, М.С. Удзел Беларускай ССР у адносінах Савецкага Саюза з капіталістычнымі краінамі (50-70-я гг.) / М.С. Варабей. – Мінск: Навука і тэхніка. – 1981. – 148 с.
6. Export helpdesk [Electronic resource]. – Mode of access: http://exporthelp.europa.eu/thdapp/display.htm?page=st%2fst_Statistics.html&docType=main&languageId=en. – Date of access: 15.03.2017.
7. Программа «Корни травы – грантовая помощь для проектов по обеспечению безопасности человека» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.by.emb-japan.go.jp/itpr_ru/index19.html. – Дата доступа: 17.03.2017.
8. Беларусь выделит средства на отдых японских детей в «Зубренке» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://people.onliner.by/2016/07/28/zubrenok-2. – Дата доступа: 02.03.2017.
9. Сайт Посольства Японии в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.by.emb-japan.go.jp/itpr_ru/sakura2016_article.html. – Дата доступа: 15.03.2017.
10. Беларусь и Япония: взаимоотношения и сотрудничество [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://elib.gstu.by/bitstream/handle/220612/13695/%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20.%20%20.%20%20%20%20%20%20%20%20%20.pdf?sequence=1. – Дата доступа: 12.03.2017.